**23.** Выберыце з прапанаваных старадаўнія адзінкі вымярэння.

*1) залатнік; 2) камень; 3) карэц; 4) шнур.*

**А)** усе прыклады. **Б)** няма патрэбных варыянтаў. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

**24.** *Развядзенне палявых сельскагаспадарчых культур, а таксама навука аб палявых культурах – … .*

**А)** палявоцтва. **Б)** поляводства. **В)** палевоцтва. **Г)** паляводства. **Д)** паліводства.

**25.** Выберыце з дадзеных словы, якія пішуцца праз злучок:

*1) (арт)салон; 2) (блок)схема; 3) (гама)прамяні.*

**А)** усе словы. **Б)** няма патрэбных варыянтаў. **В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.

**26.** Дадзены словазлучэнні:

*1) на пагранічнай застав..; 2) па шырокай дароз..; 3) на вымытай падлоз..; 4) стаялі на ўзбочын.. .*

Вызначце прыклады, у якіх назоўнікі маюць канчатак ***-е***.

**А)** усе прыклады. **Б)** няма патрэбных варыянтаў. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

**27.** Выберыце з дадзеных толькі назвы спартыўных гульняў:

*1) афсайд; 2) бейсбол; 3) галкіпер; 4) баскетбол; 5) форвард.*

**А)** усе прыклады. **Б)** няма патрэбных варыянтаў. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 5.

**28.** Дапоўніце народныя выразы па пачатку:

*а) Хочаш добра жыць – ...; б) Калі хочаш хлеб мець – ... ; в) Добрае жалеза не ржавее – ... .*

*1) добры чалавек не забываецца; 2) павінен працу любіць; 3) трэба зямліцу глядзець.*

**А)** а-1, б-2, в-3. **Б)** а-1, б-3, в-2. **В)** а-2, б-1, в-3. **Г)** а-2, б-3, в-1. **Д)** а-3, б-2, в-1.

**29.** Каго з пісьменнікаў называюць беларускім Вальтэрам Скотам?

**А)** В. Быкава. **Б)** У. Караткевіча. **В)** Я. Маўра. **Г)** В. Казько. **Д)** Г. Далідовіча.

**30.** Хто з мастакоў слова з’яўляецца аўтарам вершаваных радкоў?

*Жыццё пражыць –*
*Не поле перайсці,*
*А трэба і жыццё*
*Прайсці, як поле,*
*І хоць адным зярняткам узысці,*
*А бур’яном не зарасці ніколі.*

**А)** П. Панчанка. **Б)** В. Зуёнак. **В)** Г. Бураўкін. **Г)** Ю. Свірка. **Д)** С. Грахоўскі.

Конкурс арганізаваны і праводзіцца Грамадскім аб’яднаннем «Беларуская асацыяцыя «Конкурс» сумесна з Акадэміяй паслядыпломнай адукацыі пад эгідай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

220045, г. Мінск, вул. Яна Чачота, 16
тэл. (017) 372 36 17, 372 36 23
e-mail: info@bakonkurs.by http://www.bakonkurs.by/

ГА «БА «Конкурс». Заказ 17. Тыраж 14100 экз. г. Мінск. 2016 г.

# Конкурс па беларускай мове «БУСЛІК-2016»

*Чацвер, 18 лютага 2016 года*

- працягласць работы над заданнем 1 гадзіна 15 хвілін;
- карыстацца падручнікамі, канспектамі, даведачнай літаратурай і электроннымі сродкамі забараняецца;
- кожны правільны адказ адзначаецца трыма, чатырма ці пяццю баламі; колькасць балаў, якія атрымлівае ўдзельнік, адказваючы на пытанне правільна, вызначаецца складанасцю пытання (10 лягчэйшых пытанняў – па 3 балы, 10 найбольш складаных – па 5 балаў, астатнія 10 – па 4 балы); складанасць пытання вызначаецца па колькасці ўдзельнікаў, якія правільна на яго адказалі;
- няправільны адказ адзначаецца чвэрцю балаў, прадугледжаных за дадзенае пытанне, і залічваецца са знакам «мінус», у той час, як не даўшы адказу, удзельнік захоўвае раней набраныя балы;
- на кожнае пытанне маецца толькі адзін правільны адказ;
- на старце ўдзельнік атрымлівае авансам 30 балаў;
- максімальная колькасць балаў, якую можа атрымаць удзельнік конкурсу, – 150, аднак аўтары задання не прадугледжваюць яго поўнага выканання ўдзельнікамі. У заданне гульні-конкурсу ўключаны пытанні, веды пра якія не прадугледжаны школьнай праграмай;
- самастойная і сумленная работа над заданнем – галоўнае патрабаванне арганізатараў да ўдзельнікаў конкурсу; пры парушэнні гэтых патрабаванняў удзельнікі могуць быць дыскваліфікаваны;
- пасля заканчэння конкурсу лісток з заданнем застаецца ўдзельніку;
- вынікі ўдзельнікаў размяшчаюцца на сайце http://www.bakonkurs.by/ праз 1-1,5 месяцы пасля правядзення конкурсу.

## Заданне для вучняў 10-11 класаў

**1.** Якое слова “заблудзілася” ў радзе: *гарох, фасоля, лімон, памідор.*

**А)** няма такога слова. **Б)** гарох. **В)** лімон. **Г)** фасоля. **Д)** памідор.

**2.** Выберыце з дадзеных толькі тыя словы, у якіх на месцы пропуску неабходна напісаць літару ***ў***:

*1) для ..ладзіславы; 2) джо..ль; 3) глянуў ..верх; 4) руска-..збекскі.*

**А)** усе словы. **Б)** 1, 2. **В)** 2, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 4.

**3.** Якім членам сказа з’яўляецца выдзеленае ў сказе слова?

*Крамяныя грудастыя* ***аблокі*** *над пожняю,*
*над лесам коціць дзень* (М. Стральцоў).

**А)** дзейнікам. **Б)** выказнікам. **В)** азначэннем. **Г)** дапаўненнем. **Д)** акалічнасцю.

**4.** Падлічыце, колькі дзеясловаў у форме загаднага ладу ўжыта ў вершаваных радках П. Макаля.

*Калі на сэрцы хмарна,*
*Калі ў душы зіма,*
*Не вохкай, дружа, марна*
*І не ўздыхай дарма.*
*Не зеляней ад злосці*
*У смутку і журбе –*
*Пакліч ты сонца ў госці,*
*Як друга, да сябе.*

**А)** 0. **Б)** 2. **В)** 3. **Г)** 4. **Д)** 5.

**5.** Колькі слоў у дадзеным сказе?

*Усюзімужыўзаяцнаастраўкупасяродшырокайракі.*

**А)** 6. **Б)** 7. **В)** 8. **Г)** 9. **Д)** 10.

**6.** У вершаванай загадцы С. Шах схавалася незвычайнае слова-амонім:

*Вось драпежны птах вялікі, –*
*Збіты зараз з панталыку,*
*Бо не ведаў, што фактычна*
*У інструментах ён музычных,*
*І яшчэ апроч таго –*
*Нейкі штэмпель ён, кляймо.*

**А)** грыф. **Б)** корт. **В)** кардон. **Г)** аркуш. **Д)** бокс.

**7.** Выберыце з дадзеных толькі назоўнікі жаночага роду.

*1) пароль; 2) столь; 3) медаль; 4) вермішэль.*

**А)** усе прыклады. **Б)** няма патрэбных варыянтаў. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 3. **Д)** 2, 4.

**8.** Вызначце, якія дзеепрыслоўі з дадзеных напісаны правільна.

*1) разбегшыся; 2) падышоўшы; 3) наглядзеўшысь.*

**А)** усе прыклады. **Б)** няма патрэбных варыянтаў. **В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.

**9.** Якая літара ў беларускім алфавіце стаіць адразу пасля ***і***?

**А)** ё. **Б)** ж. **В)** к. **Г)** й. **Д)** м.

**10.** Выберыце з дадзеных слова(-ы), у якім(-іх) на месцы пропуску неабходна напісаць літару ***е***:

*1) кам..нтатар; 2) камбін..зон; 3) зацв..таць.*

**А)** усе словы. **Б)** няма патрэбных варыянтаў. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3.

**11.** Якія словы з дадзеных напісаны правільна?

*1) бездарожа; 2) разводдзе; 3) палоззе; 4) смеце.*

**А)** усе словы. **Б)** 1, 2. **В)** 1, 4. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

**12.** Выберыце з дадзеных прыклады, у якіх словы пішуцца з вялікай літары.

*1) (Дз, дз)ень ведаў; 2) (С, с)афійскі сабор; 3) (М, м)ележаўскія чытанні.*

**А)** усе прыклады. **Б)** няма патрэбных варыянтаў. **В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.

**13.** Дадзены прыметнікі *безгаспадарлівы, безгаспадарны, безгаспадарчы*. Якое слова мае значэнне *‘які не мае гаспадара, які нікому не належыць’*?

**А)** усе словы. **Б)** няма патрэбнага варыянта. **В)** безгаспадарлівы. **Г)** безгаспадарны. **Д)** безгаспадарчы.

**14.** У народзе здаўна існуе прыкмета:

*Мышы ў лёне робяць гнёзды – зімой будзе … .*

**А)** цёпла. **Б)** адліжна. **В)** мокра. **Г)** мала снегу. **Д)** вялікі снег.

**15.** Выберыце з дадзеных правільна напісаныя словазлучэнні:

*1) сумаваць па матулі; 2) паехаць па білеты; 3) ведаць пра спаборніцтвы.*

**А)** усе правільныя. **Б)** няма правільных варыянтаў. **В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.

**16.** Якія лічэбнікі з прапанаваных напісаны правільна ў форме роднага склону?

*1) дзвух; 2) пяцідзесяці; 3) мільёну; 4) дзевяцісот.*

**А)** усе прыклады. **Б)** няма правільных варыянтаў. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 3. **Д)** 2, 4.

**17.** Для размежавання амонімаў і мнагазначных слоў ёсць пэўныя спосабы. Выберыце патрэбныя варыянты з прапанаваных:

*1) падбор сінонімаў; 2) падбор роднасных слоў;*
*3) спалучальнасць з іншымі словамі.*

**А)** усе варыянты. **Б)** няма правільных варыянтаў. **В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.

**18.** У якіх словах з дадзеных на месцы пропуску неабходна напісаць літару *э*?

*1) бут..рброд; 2) д..серт; 3) гард..роб; 4) хр..бет;*
*5) аранж..рэя; 6) інц..дэнт.*

**А)** ва ўсіх словах. **Б)** няма правільных варыянтаў. **В)** 1, 2, 3. **Г)** 2, 3, 4. **Д)** 4, 5, 6.

**19.** У антычнай культуры існавала пяць прынцыпаў дасканаласці. Выберыце з дадзеных патрэбныя варыянты:

*1) заканамернасць; 2) арганізаванасць; 3) прадпрымальнасць;*
*4) прапарцыянальнасць; 5) эмацыянальнасць; 6) мэтазгоднасць;*
*7) сіметрычнасць; 8) высакамернасць.*

**А)** 1, 2, 3, 4, 5. **Б)** 1, 2, 4, 6, 7. **В)** 2, 3, 4, 7, 8. **Г)** 2, 3, 5, 6, 8. **Д)** 3, 5, 6, 7, 8.

**20.** Даўней назвы колераў давалі па пэўных прыкметах. Якой устарэлай назве адпавядае *зялёны з шараватым адценнем колер*?

**А)** сілковы. **Б)** ружовы попел. **В)** танга. **Г)** асінавы. **Д)** электрык.

**21.** *Невялікі твор, паэтычны па змесце і празаічны па форме выяўлення гэтага зместу – … .*

**А)** верлібр. **Б)** версэт. **В)** абразок. **Г)** бурлеска. **Д)** балада.

**22.** Героямі якіх твораў з’яўляюцца: *1) Архіп Лінкевіч; 2) Аляксандр Пятровіч Чарнавус; 3) пан Патоцкі; 4) Янка Тукала.*

*а) Я. Купала “Курган”; б) Я. Колас “На ростанях”;*
*в) М. Гарэцкі “Роднае карэнне”; г) Я. Купала “Паўлінка”;*
*д) К. Крапіва “Хто смяецца апошнім”; е) Я. Колас “Новая зямля”;*
*ё) К. Крапіва “Партызаны”.*

**А)** 1-е, 2-ё, 3-г, 4-в. **Б)** 1-б, 2-в, 3-д, 4-а. **В)** 1-а, 2-б, 3-е, 4-ё. **Г)** 1-г, 2-а, 3-б, 4-е. **Д)** 1-в, 2-д, 3-а, 4-б.